# У ДОБРЫ ШЛЯХ, СТУДЭНТЫ!

ПРОЙДУЦЬ ГАДЫ НАВУЧАННЯ, ВЫ ЗДАСЦЕ ДЗЯРЖАЎНЫЯ ЭКЗАМЕНЫ, АБАРОНІЦЕ ДЫПЛОМЫ, ЗЗАДУ ЗАСТАНУЦЦА ЗАЛІКІ І ПРАЕКТЫ. АЛЕ ЗАКАНЧЭННЕ ВУЧОБЫ — ГЭТА ТОЛЬКІ ПАЧАТАК ВАШАЙ ПРАЦОЎНАЙ БІЯГРАФІІ. І КУДЫ Б ВЫ НІ ПРЫЙШЛІ ПРАЦАВАЦЬ, ВЫ ПРЫНЯСЕЦЕ З САБОЙ ТОЕ, ШТО ВАМ ШЧОДРА ДАЛІ СТУДЭНЦКІЯ ГАДЫ,— ІДЭЙНУЮ ПЕРАКАНАНАСЦЬ, ГЛЫБОКІЯ ВЕДЫ, ЛЮБОЎ ДА СВАЁЙ ПРАФЕСІІ, АДДАНАСЦЬ СВАЁЙ ВЯЛІКАЙ РАДЗІМЕ.

ХАЙ ЖА Ў ВАШЫХ ІМКНЕННЯХ, У СПРАВАХ І МАРАХ БУДЗЕ ЗАЎСЁДЫ ЖЫВЫ ДУХ ВАШАЙ СТУДЭНЦКАЙ МАЛАДОСЦІ, ХАЙ НЕ АСТЫВАЕ ПОЛЫМЯ ВАШЫХ СЭРЦАЎ, ХАЙ ЧЫСТЫЯ І ВЫСАКАРОДНЫЯ БУДУЦЬ ВАШЫ ДУМКІ.

Л. І. БРЭЖНЕЎ.

ПРАЛЕТАРЫІ ЎСІХ КРАІН, ЯДНАЙЦЕСЯ!

# Беларускі УНІВЕРСІТЭТ

ОРГАН ПАРТКОМА, РЭКТАРАТА, МЯСЦКОМА, КАМІТЭТА КАМСАМОЛА І ПРАФКОМА БЕЛАРУСКАГА ОРДЭНА ПРАЦОЎНАГА ЧЫРВОНАГА СЦЯГА ДЗЯРЖАЎНАГА УНІВЕРСІТЭТА ІМЯ У. І. ЛЕНІНА

№ 25 (1137) ● 2 верасня 1976 г. ● Цана 2 кап. ● Газета выходзіць з 1935 г.



ПЕРШАЯ ЛЕКЦЫЯ НОВАГА СЕМЕСТРА

## ДОБРЫ ДЗЕНЬ, УНІВЕРСІТЭТ!

Вось і ўсё ўжо ззаду. Ззаду засталіся ўступныя экзамены і тая ні з чым не параўнальная боязь перад імі. Зараз вывесяць спіс, і яны — самі паступаючыя, іх бацькі — даведаюцца аб прозвішчах шчаслівчыкаў. Напружаныя, нецярплівыя позіркі — ну, хутчэй жа!

— Дзяўчынка, прабачце, што вы зараз адчуваеце?

— Ой, ды я хвалююся больш нават, чым перад экзаменамі. А калі раптам не залічылі?

І вось нарэшце дзверы расчыніліся, натоўп рынуўся да бялеючых на стэндах лісткоў з прозвішчамі ўжо не абітурыентаў БДУ імя У. І. Леніна, а студэнтаў-першакурснікаў універсітэта.

— Ёсць! Прынялі! — высокага росту юнак са шчаслівай усмешкай на твары праціскаецца да выхаду.

— Наташка, пайшлі, ну хто там цябе яшчэ цікавіць?

— Ну я, я!

— Ну ты ж ёсць...

Сумна пазірае хлопец у акулярах на радасна-ўзбуджаных рабят: ім проста пашанцавала. А ля сцяны студэнты-«стажнікі» з веданнем справы тлумачаць навічкам: «Галоўнае — пратрымацца першы год, і тады ты — студэнт. А наогул, рабяты, вучыцца трэба».

Ужо каторы раз, праглядаючы спіс, знаходзіць сваё прозвішча Іра Радкевіч.

— Я ніяк не магу паверыць, што паступіла. А ў вёсцы як усе абрадуюцца!

Яшчэ ў школе самым цікавым і захапляючым для дзяўчыны стаў свет лічбаў, формул, задач, а на выпускных экзаменах яна канчаткова рашыла паступаць толькі на матэматычны факультэт універсітэта. І вось яна ўжо студэнтка.

— Думала, не прайду, — гаворыць Іра, — асабліва баялася экзамена па фізіцы. Але, як бачыце, усё добра. Я такая шчаслівая!

Стаў студэнтам філфака Іосіф Янушкевіч. Ён толькі ў гэтым годзе скончыў сярэднюю школу.

— Літаратурай захапляюся яшчэ з сёмага класа. Вельмі люблю беларускую мову, крыху пішу вершы. У вольныя хвіліны часта засяджваюся ў сваёй дамашняй бібліятэцы, каб яшчэ раз перачытаць любімага сучаснага празаіка Уладзіміра Караткевіча. Мне падабаецца гістарызм яго твораў.

Фізіка ўвайшла ў жыццё Уладзіміра Мартынюка яшчэ са школьных гадоў. З таго часу імкненне вучыцца на фізфаку не пакідала яго. Першая спроба паступіць у БДУ для дзесяцікласніка Валодзі аказалася няўдалай — не хапіла балаў. Ужо пасля арміі Уладзімір паступае на факультэт ядзернай фізікі Кіеўскага універсітэта, але з-за недасканалага ведання ўкраінскай мовы вучобу прыходзіцца пакінуць. І вось цяпер хлопец зноў знаходзіць сваё прозвішча ў спісах залічаных на першы курс фізічнага факультэта БДУ.

— Лічу, што ў пераадольванні цяжкасцей вельмі дапамагае спорт. Сам я займаюся ў Бабруйскім спартыўным таварыстве «Спартак», удзельнічаю ў шматлікіх спаборніцтвах па цяжкай атлетыцы. Фізіка і спорт для мяне — адзінае цэлае, і я не ўяўляю сябе без іх.

Для гэтых рабят першы самастойны крок зроблен. Наперадзе вучоба, навуковая работа, дыспуты, вечары. Як пройдуць пяць студэнцкіх год, ці будуць яны цікавымі і насычанымі, залежыць ад іх саміх. Хочацца верыць, што знойдзе сваю сцяжынку ў вялікую літаратуру Іосіф Янушкевіч, што будзе дапамагаць у арганізацыі вечароў, сустрэч, канцэртаў на мехмаце Іра Радкевіч, што будзе на фізфаку яшчэ адным выдатнікам і спартсменам больш.

А цяпер яны смела могуць сказаць: «Добры дзень, мой універсітэт!».

Л. КАЧКО,
І. САВЕТКІНА.

## НЕ ШТУРМАМ, А ПА СІСТЭМЕ

### ДА ПЫТАННЯ АБ АРГАНІЗАЦЫІ ПРАЦЫ СТУДЭНТАЎ ПРЫ ПАДРЫХТОЎЦЫ І ЗДАЧЫ ЭКЗАМЕНАЎ І ЗАЛІКАЎ

Агульнавядома, што залогам паспяховай здачы экзаменаў і залікаў з'яўляецца сістэматычная, добрасумленная праца студэнтаў на працягу ўсяго семестра ці навучальнага года. Вопыт паказвае, што нават больш падрыхтаваныя студэнты не маюць магчымасці засвоіць увесь вучэбны матэрыял па таму ці іншаму вывучаемаму курсу штурмам. Да таго ж «штурмавы» спосаб вывучэння вучэбнага матэрыялу, як устанаўлівае псіхалогія, прыводзіць да хуткага яго забыцця. Адсюль вынікае адно з галоўнейшых педагагічных правіл: каб дабіцца на залікова-экзаменацыйнай сесіі высокіх вынікаў, неабходна на працягу ўсяго семестра ці года займацца сістэматычна і планамерна. Толькі такая падрыхтоўка забяспечвае цвёрдыя і трывалыя веды.

На жаль, у арганізацыі самастойнай работы некаторых студэнтаў над вучэбнымі курсамі назіраюцца сур'ёзныя недахопы. Нярэдкія, напрыклад, выпадкі, калі работа на працягу семестра працякае няпланава, неарганізавана, калі маюць месца дні поўнага адпачынку і дні стамляючага напружання. Усё гэта яўна супярэчыць аднаму з галоўнейшых патрабаванняў навуковай арганізацыі самастойнай працы студэнтаў — яе планамернасці, арганізаванасці і сістэматычнасці.

Але якой бы ідэальнай ні была арганізацыя вучэбнай працы студэнтаў на працягу ўсяго семестра ці навучальнага года, дадатковая падрыхтоўка да экзаменаў і залікаў з'яўляецца, як паказвае вопыт, неабходнай.

Пачынаць яе пажадана своечасова — за месяц-паўтара да пачатку залікова-экзаменацыйнай сесіі. Тэрмін гэты неабходны таму, што паўтарыць адразу ўвесь пройдзены паўгадавы ці гадавы вучэбны матэрыял адначасова па ўсіх прадметах, вынесеных на экзаменацыйную сесію, фізічна немагчыма. Таму кожнаму студэнту неабходна загадзя выдзеліць і спланаваць час для паўтарэння. Адзіным крытэрыем пры гэтым з'яўляецца ступень цяжкасці прадметаў, якія падлягаюць паўтарэнню. Для кожнага студэнта яны будуць рознымі. У адпаведнасці з тым, наколькі цяжкія прадметы, вызначаецца і чарговасць падрыхтоўкі да іх. Так узнікае неабходнасць у складанні індывідуальных планаў падрыхтоўкі студэнтаў да залікова-экзаменацыйнай сесіі, у якіх лёгкія і цяжкія прадметы павінны чаргавацца.

Між тым, у падрыхтоўцы да экзаменаў і залікаў кожны студэнт можа зыходзіць з агульнага патрабавання — неабходнасці захавання найстражэйшай планавасці ў адносінах размеркавання бюджэту вучэбнага часу, звярнуўшы пры гэтым асаблівую ўвагу на недапушчальнасць вучэбнай перагрузкі. Вось чаму важна, каб у індывідуальных планах падрыхтоўкі да экзаменаў і залікаў знайшлі адлюстраванне не толькі пытанні арганізацыі працы, але і адпачынку.

Акрамя таго, важна дабіцца безагаворачнага выканання плана, строгага захавання рэжыму дня і асабліва чаргавання разумовай працы з адпачынкам. Натуральна, што ўперыяд падрыхтоўкі і самой залікова-экзаменацыйнай сесіі разнастайныя ўвесяленні павінны быць строга абмежаваны. Заняткі фізкультурай і спортам пажадана зрабіць умеркаванымі, а паўнацэнны сон і прагулкі перад сном на свежым паветры — строга абавязковымі.

Важным з'яўляецца і пытанне аб тым, якім чынам належыць весці паўтарэнне вучэбнага матэрыялу. Існуе некалькі такіх спосабаў. Адным з найбольш педагагічна мэтазгодных з'яўляецца стараннае і дэталёвае паўтарэнне ўсяго вывучанага вучэбнага матэрыялу па таму ці іншаму прадмету. Такое паўтарэнне дазваляе дабіцца цвёрдых і трывалых ведаў, а, такім чынам, і высокай адзнакі на экзамене. Другім не менш абгрунтаваным спосабам паўтарэння з'яўляецца старанная сістэматызацыя вучэбнага матэрыялу на аснове ўмацавання раней устноўленых студэнтамі сувязей паміж асобнымі тэмамі і раздзеламі. Гэта спосаб дазваляе засвойваць вучэбны матэрыял як адзінае цэлае, як лагічна стройны змест прадмета.

У выключных выпадках ужываецца і трэці спосаб паўтарэння вучэбнага матэрыялу — беглы прагляд яго. Ён выкарыстоўваецца толькі ў тым выпадку, калі студэнт на працягу ўсяго навучальнага года добрасумленна прапрацаваў увесь матэрыял. У іншых жа выпадках ён мала эфектыўны. Напрыклад, пры павярхоўнай, неглыбокай прапрацоўцы вучэбнага матэрыялу гэты спосаб паўтарэння не паглыбіць яго, не палепшыць яго якасць.

Часам выкарыстоўваецца і чацвёрты спосаб паўтарэння — разгляд толькі некаторых пытанняў з усяго матэрыялу, выбраных наўздагад. Адразу неабходна заўважыць, што гэты спосаб амаль зусім не эфектыўны. Больш таго, ён у сваёй аснове шкодны... таго, ён у сваёй аснове ганебны, характарызуецца фармальным падыходам да працэсу навучання. Выкарыстоўваюць яго толькі тыя студэнты, якія не імкнуцца атрымаць надзейныя і трывалыя веды. Вопыт паказвае, што такім студэнтам цяжка бывае здаць экзамен не толькі з першага, але і з пятага разу.

Прыступаючы да паўтарэння вучэбнага матэрыялу, студэнт заўсёды сустракаецца з цэлым шэрагам пытанняў, такіх, як: з чаго пачынаць паўтарэнне; як прыступіць да паўтарэння; як укласціся ў час; якім чынам паўтараць вучэбны матэрыял.

Адказваючы на першае пытанне, трэба адзначыць, што пачынаць паўтарэнне неабходна з аналізу вучэбнай праграмы па прадмету, у працэсе якога студэнт адзначае, на якія тэмы ці раздзелы патрэбна звярнуць асаблівую ўвагу ў выніку іх недастатковага засваення на лекцыях ці семінарскіх занятках. Гэта дазволіць яму правільна спланаваць час і больш спыніцца іменна на гэтых слаба засвоеных раздзелах праграмы. Немэтазгодна паўтараць вучэбны матэрыял па білетах ці пытаннях, бо пры гэтым парушаецца сістэма ведаў і магчымы пропускі асобных тэм ці раздзелаў праграмы, што вядзе да іх недапрацоўкі.

Прыступаючы да паўтарэння канкрэтнага раздзела, студэнт павінен засвоіць галоўнейшыя паняцці, палажэнні, гіпотэзы, фармуліроўкі, а таксама разгледзець і прадумаць неабходныя практычныя прыклады і задачы з тым, каб на экзамене выкарыстаць іх у якасці практычнага падмацавання тэарэтычных палажэнняў.

Пры паўтарэнні кожнага раздзела ў студэнта маюцца чатыры крыніцы — канспекты лекцый, падручнікі і запісы з рэкамендаванай літаратуры і заметкі, зробленыя на кансультацыях ці семінарскіх занятках. З якой жа крыніцы належыць пачынаць? Даследаванні паказваюць, што паўтарэнне лепш за ўсё трэба пачынаць з чытання канспекта лекцый, затым можна прыступаць да чытання падручніка і ў заключэнне — да прагляду запісаў з рэкамендаванай літаратуры і заметак на кансультацыях і семінарах.

Чым жа тлумачыцца такі парадак паўтарэння? У канспектах лекцый, як вядома, запісана ўсё галоўнае ў сціслай і кароткай форме, пры гэтым з улікам усіх навейшых дасягненняў гэтай навукі. Таму іменна з гэтага галоўнага і належыць пачынаць паўтарэнне канкрэтнага курса. Але гэтым нельга абмежавацца, бо універсітэцкія дысцыпліны студэнт павінен засвоіць грунтоўна. А гэта можа даць толькі падручнік. Вось чаму следам за канспектам лекцый павінна ісці работа з падручнікам і вучэбнымі дапаможнікамі. У сувязі з гэтым узнікае пытанне: а ці нельга абмежавацца пры паўтарэнні курса прапрацоўкай аднаго толькі падручніка? Аказваецца, нельга, бо падручнік можа не адлюстраваць некаторых навейшых даных, так як падручнікі перавыдаюцца не часта, а навука не стаіць на месцы, яна хутка развіваецца, у ёй паяўляюцца ўсё новыя даныя і адкрыцці. Гэтыя даныя і адкрыцці, а таксама іншыя новыя дасягненні, пра якія пакуль нічога не сказана ў падручніках, ёсць у канспектах лекцый і іншых крыніцах, якія ўпаміналіся намі,—у запісах з рэкамендаванай літаратуры і заметках, зробленых студэнтамі на кансультацыях і семінарскіх занятках. Адсюль відавочна наступнае педагагічнае правіла: для глыбокага засваення ведаў усе крыніцы паўтарэння—канспекты лекцый, падручнікі, запісы з рэкамендаванай літаратуры і заметкі студэнтаў, зробленыя імі на кансультацыях і семінарскіх занятках, — мэтазгодна выкарыстоўваць у адзінстве.

М. ПІСКУНОЎ,
дацэнт, загадчык кафедры педагогікі.

# ТРЭЦІ ПРАЦОЎНЫ

**Летам адкрыццяў называюць трэці працоўны семестр. І гаворка ідзе не толькі пра знаёмства з далёкімі краямі або пра суму заробленых грошай. Мы гаворым аб адкрыццях больш важных—адкрыццях сябе і сяброў, аб набыцці грамадзянскай сталасці, мудрасці, умення адказваць за свае справы і ўчынкі.**

**Студэнцкія атрады — гэта не проста сезонны вытворчы калектыў. Тут адбываецца сур'ёзны выхаваўчы працэс, фарміруецца асоба заўтрашняга камандзіра вытворчасці.**

**Увявіць сабе сёння камсамол ВНУ без студэнцкіх атрадаў немагчыма. СБА сталі кроўнай справай камсамола, канкрэтным укладам у працоўнае і грамадска-палітычнае жыццё краіны.**

**Ні ў кога з байцоў гэтага семестра не было лёгкага лета, лёгкіх удач. Памятаеце, што запісаў Маркс у анкеце! «Шчасце — гэта барацьба». Не цуд і яго чаканне, а барацьба. Шмат пытанняў паставіла лета перад студэнтамі. Ім прыйшлося сутыкнуцца з сапраўднымі жыццёвымі цяжкасцямі, самастойна вырашаць вытворчыя праблемы.**

**Нам вельмі прыемна, што студэнты Беларускага дзяржаўнага універсітэта вытрымалі праверку трэцім працоўным семестрам, што атрады БДУ аказаліся ў ліку лепшых. Вялікіх удач вам і ў вучобе, байцы СБА, байцы пяцігодкі!**

## НАШ АДРАС—БАМ

На карце нашай Радзімы гэты раён Якуціі называецца Алданскім нагор'ем. Тут, уздоўж старога Якуцкага тракту, будзе пракладзена паўночная ветка БАМа Тында-Беркакіт. Яна звяжа буйнейшыя прамысловыя прадпрыемствы Усходняй Сібіры з багацейшымі залежамі карысных выкапняў Паўднёвай Якуціі. Зараз тут будуюцца важнейшыя аб'екты Паўднёва-Якуцкага вугальнага комплексу, стварэнне якога аб'яўлена Усесаюзнай камсамольскай ударнай будоўляй. Адна з састаўных частак яго — Нерунгрынская ГРЭС, збудаванне якой пачынаецца ў наваколнай мясцовасці горада Нерунгры, горада, які толькі што паявіўся на картах. Электрастанцыя будзе працаваць на вугалі, які здабываецца ў адкрытых кар'ерах.

Сюды, у пасёлак Сярэбраны Бор, дзе будуць жыць будаўнікі ГРЭС, прыбылі першыя студэнцкія атрады. Адкрыццё студэнцкай будоўлі ў гэтым пасёлку належыць атрадам з Белдзяржуніверсітэта — «Аэліце» і імя Ленінскага камсамола.

Зараз Сярэбраны Бор налічвае ўсяго некалькі дамоў, размешчаных на схілах маляўнічай сопкі. Але да канца года пасёлак вырасце амаль утрая. Планам жыллёвага будаўніцтва тут прадугледжваецца ўзвядзенне трохпавярховага будынка дзіцячага сада, школы, інтэрнатаў, сталовых і іншых аб'ектаў. І ўсюды будаўніцтва пачынаецца з першага калочка, забіваемага сярод векавых зараснікаў тайгі. Скальны грунт абцяжарвае вядзенне земляных работ. Тым не менш літаральна на працягу тыдня ў асноўным былі закончаны работы па падрыхтоўцы траншэй пад фундаменты. На ўсіх аб'ектах байцы працавалі, як тут гавораць, па-бамаўску, нягледзячы на неспрыяльныя кліматычныя ўмовы. У атрадах былі прыняты высокія сацыялістычныя абавязацельствы, складзены планы па палітыка-выхаваўчай і культурна-масавай рабоце. На трэці дзень пасля прыбыцця ў пасёлак агітбрыгада СБА імя Ленінскага камсамола выступіла перад рабочымі з першым канцэртам. У плане работы агітбрыгады — пяць канцэртных праграм для будаўнікоў БАМа. А ўсяго за працоўны семестр студэнты далі шаснаццаць канцэртаў. Сіламі байцоў была аформлена наглядная агітацыя. Атрад выступіў з ініцыятывай стварыць першую бібліятэку ў Сярэбраным Бары. Тысяча кніг, сабраных беларускімі студэнтамі і школьнікамі Мінска, перададзена ў фонд новай бібліятэкі.

Студэнты-беларусы арганізавалі фотаатэлье «За дзякуй». Хутка запоўнілася кніга водгукаў і прапаноў — знак прызнасці будаўнікоў студэнтам БДУ, байцам СБА.

Так нараджаецца пасёлак. Так нараджаюцца традыцыі.

**В. РОШЧЫН,**
**камісар СБА імя Ленінскага камсамола.**



## БУДАВАЦЬ—ГЭТА ЗДОРАВА

— А што ты умееш рабіць? — у голасе вопытнага камандзіра атрада Валянціна Паўлючэнкі адчувалася і ледзь прыкметная перавага, і насцярожанасць: што патрэбна журналісту, які прыехаў на адзін дзень, а просіцца на працу?

Спецыялістам я на будоўлі не быў. І камандзір вырашыў:

— Пойдзеш на падноску цэглы і бетону. Паглядзім, што з гэтага атрымаецца.

Так карэспандэнт быў часова залічан у састаў СБА «Універсітэцкі» гістфака БДУ. З правам нашэння фотаапарата і блакнота, канешне. Мне выдалі камбінезон, шлем, абутак, словам, усю экіпіроўку, якая нават навічку на будоўлі надавала выгляд бывалага мантажніка.

У вёсцы Старыя Шаўры Крупскага раёна байцы атрада будавалі новую школу. Згодна з дагаворам за два летнія месяцы школа павінна быць пабудавана, застануцца толькі аддзелачныя работы. Сцены з белай цэглы ужо падняліся белым вострававам сярод зеляніны садоў.

Калгасу «Сцяг камунізму» вельмі патрэбна гэта школа. Яе неабходнасць адчуваецца больш за ўсё нават не ў словах дырэктара школы Л. Я. Сяліцкага і старшыні калгаса Н. С. Бурага. Гэта пацвярджае выгляд старога будынка з бярвення з шыльдай «Школа». Сімвалічна, што атрад дыслацыруецца іменна ў гэтых сценах. «Не часта чалавек мае магчымасць пераконвацца ў сваёй карыснасці», — сказаў на гэты конт камсорг атрада Міша Паўлюшчык...

Гарачы сёння дзень. Сонца па - паўднёваму угрызаецца ў нашы твары і спіны. Незвычайны сёння дзень: для атрада ён — дзень салідарнасці з працоўнымі новага адзінага В'етнама. Усе зароблены грошы пойдуць на будаўніцтва Палаца піянераў у Ханоі.

Паўнаўладная гаспадыня бетонамяшалкі — Тамара Рупека.

— Ваду! Цэмент! Пясок! — яе адрывістыя каманды. Рыдлёўка за рыдлёўкай—у бяздонную прорву. Бетон расцякаўся па артэрыях будоўлі бесперапынна. Але яна зноў патрабавала:

— Яшчэ!

Калі раствор аказваўся густаватым або звадкаваны, кладчыкі бяззлобна прапаноўвалі:

— Тамара, пратры акуляры!

І Тамара працірала сапраўды заляпаныя цэментам акуляры.

У камандзіра — свае клопаты. Зараз ён вядзе непрыемную размову з інжынерам і майстрам МБА: на будоўлю пастаўляюць недабраякасныя жалезабетонныя блокі, ды і тыя—нерэгулярна.

...Быў абедзенны перапынак. Экспромтам — выступленне агітбрыгады перад калгаснымі механізатарамі. Стыхійна—размова: чаму мы прыехалі ў атрад?

Аня Кузюковіч:

— Хачу навучыцца разумець людзей. Для пачатку — сваіх аднакурснікаў. Тут бачу іх у новым асвятленні, ці што.

А яшчэ мяне на будоўлі навучылі працаваць рыдлёўкай. Гэта, ведаеце, таксама навука.

Валодзя Аляксееў:

— Тут я адчуваю сябе моцным. Аказваецца, магу не толькі вучыцца, але і будаваць школу, у якой буду вучыць іншых.

Валянцін Паўлючэнка:

— Мне ўжо трыццаць. Я шмат будаваў. Але школа — першая. Вельмі хачу ўбачыць у жнівні гарызонт з вышыні двух месяцаў нашага семестра. З вышыні двух паверхаў будучай школы—усе чатыры вёскі калгаса, адкуль прыйдуць у школу 192 чалавекі.

...Заходзячае сонца промнямі падлічвала рады новай цагельнай кладкі і бетонных канструкцый, якія леглі ў будынак школы. Лічылі і мы: пакладзена 10 кубамет-

**Опять зовёт знакомая работа.**
**Вновь лето отблестит на мастерках,**
**Вновь от него останется соль года**
**И новые стихи в черновиках.**
**А это вновь — испытанная смелость,**
**Проверенная сила наших рук,**
**А это — песня, что в дороге пелась,**
**В вагонах под колесный перестук.**
**Опять ребят по звёздным направленьям**
**Целинные увозят поезда —**
**И стройотряд звучит, как пополненье**
**Передовой ударного труда.**

# ФІНІШАВАЎ

Павольна нясе свае воды апетая ў вершах і паэмах прыгажуня Арэса. І хоць даўно ўжо асушаны славутыя Марыінскія балоты, а на месцы былой багны каласіцца збажына, наступ на палескую «цаліну» працягваецца.

Шосты год запар удзельнічае ў гэтым штурме наш «Буравеснік» імя Героя Савецкага Саюза В. І. Казлова. Шосты год юнакі і дзяўчаты з філалагічнага факультэта БДУ імя У. І. Леніна прыязджаюць у легендарную Рудабельскую рэспубліку, без якой немагчыма ўявіць наш атрад.

**У мінулай пяцігодцы працавалі мы ў ПМК-37 трэста «Гомельводбуд». За гэты час атрадам асвоена каля 200 тысяч рублёў капіталаўкладанняў, што ў перакладзе на будаўнічую тэрміналогію складае 50 кіламетраў асушальных каналаў. За гэтымі лічбамі крыюцца дзесяткі і сотні гектараў новых зямель, перададзеных гаспадаркам раёна.**

**Але не толькі працаваць па-ўдарнаму ўмеюць будатрадаўцы. Ударнай справай «Буравесніка» з'яўляецца шэфства над помнікамі і абеліскамі загінуўшым воінам і партызанам. Мы не толькі шэфствуем, але і самі ўзводзім помнікі. Так, у 1973 годзе на месцы партызанскага аэрадрома каля вёскі Парэчча студэнтамі пабудаваны мемарыяльны Знак, які па форме нагадвае самалёт. На месцы дыслакацыі Мінскага падпольнага абкома партыі ў вёсцы Дзвесніца атрадам пабудаваны музеі-зямлянкі В. І. Казлова і штаба. А ў дзесятай пяцігодцы на свае сродкі мы адкрыем тут мемарыяльны комплекс. Кожны год у атрадзе дзейнічае бюро добрых паслуг, мэтай якога з'яўляецца дапамога інвалідам і ветэранам вайны і працы. Так, ужо зараз студэнты накасілі і прывезлі сена Мордус**рам выступленні нашых артыстаў ля кастра на беразе паўнаводнай Арэсы. Цікава прайшоў сумесны агляд мастацкай самадзейнасці мясцовай моладзі і нашых агітбрыгад. А колькі кветак і апладысментаў было на «аўтарскіх» вечарах Дзмітрыя Клі-

атрадзе. Традыцыйнымі сталі выступленні маленькіх артыстаў у саставе нашай агітбрыгады.

Вялікую ўвагу ўдзялялі мы абсталяванню лагера. Ад таго, з якім густам ён пабудаваны, наколькі ўдала скампанаваны яго элементы,

ды СБА «Полымя» Гомельскага універсітэта. Праведзены таварыскія сустрэчы з камандамі іншых атрадаў.

**Год 1976-ы — першы год новай пяцігодкі. Па ініцыятыве перадавых прадпрыемстваў краіны дзесятую пяцігодку вырашана ператварыць у**

# СВОЙ СЛЕД НА ЗЯМЛІ

**Надзеі Кузьмінічне, парэзалі і пакалолі дровы Шчэцька Ганне Паўлаўне і іншым. Адбыўся вечар сустрэчы мясцовай моладзі і студэнтаў з ветэранамі вайны вёскі Буда.**

Прыкметна ажыўляецца з прыездам атрада і работа мясцовых клубаў, бібліятэк. Цяжка знайсці ў раёне населеныя пункты, дзе б не пабывалі з канцэртамі і лекцыямі байцы «Буравесніка». Сумесныя з мясцовай моладдзю вечары адпачынку і дыспуты, суботнікі па нарыхтоўцы кармоў, канферэнцыі па кнігах і кінафільмах — гэтае і многае іншае стала неад'емнай састаўной часткай работы нашага атрада. Так, прыйшліся да спадобы ў гэтым годзе мясцовым жыха-

мовіча, Леаніда Цвіліка!

Студэнцкія будаўнічыя атрады — гэта яшчэ і цэнтры работы па прафесійнай арыентацыі сельскай моладзі. Не выпадкова ў нашым сёлетнім атрадзе працавалі байцамі двое ураджэнцаў Акцябршчыны, якія прайшлі школу падрыхтоўкі пры нашым кансультацыйным пункце.

Сёлета намі аформлена пяць стэндаў, якія расказваюць аб факультэтах універсітэта і асноўных прафесіях, якія можна на іх атрымаць. СБА «Буравеснік» імя В. І. Казлова выступіў адным з ініцыятараў арганізацыі піянерскіх лагераў - «спадарожнікаў». Больш дваццаці хлопчыкаў і дзяўчынак весела і цікава праводзілі свой час сёлета пры

залежаў у канчатковым выніку адпачынак байцоў, а, значыць, і сама праца, настрой. Ды і самому прыемна пасядзець у альтанцы, на пяньках «кахання» і «развітання», прайсціся па акуратна выкладзеных дарожках да інтэрната. Па добрай звычцы пераможцаў сацыялістычнага спаборніцтва паміж брыгадамі повары кафэ «Чабарок» Дзіяна Папова і Алена Бордак сустракалі румянымі караваямі. Памятныя сувеніры і пірагі ўручаліся імяніннікам у дні нараджэння.

Не забыты ў атрадзе і спорт. Прайшоў спартыўны тыдзень з мясцовымі спартсменамі. Першую гульню правяла на першынстве Акцябрскай зоны і каманда футбалістаў, выйграўшы з лікам 1:0 у каман-

**пяцігодку якасці, рабочай гарантыі. Наш атрад, уключыўшыся ва Усесаюзнае спаборніцтва, звярнуўся да ўсіх атрадаў БДУ імя У. І. Леніна і Акцябрскага раёна з заклікам працаваць пад дэвізам: «Пяцігодку — за чатыры гады, пяцідзёнку — за чатыры дні». На сходзе байцы атрада вырашылі пяцігадовы план — 200 тысяч рублёў капіталаўкладанняў — асвоіць датэрмінова, да 1-га верасня 1979 года, а кожны аб'ект здаваць толькі з адзнакамі «добра» і «выдатна».**

Па плану мы свой аб'ект павінны былі закончыць да 10 жніўня. Але зрабілі гэта раней.

**М. ПРЫГОДЗІЧ, камандзір СБА «Буравеснік» імя В. І. Казлова, аспірант БДУ імя У. І. Леніна.**



раў цагельнай кладкі, узведзены рыштаванні для далейшай працы.

— Баста! — сказаў Краўчук і працягнуў мне цыгарэту з тытунёвага фонду атраднай камуны.

Канешне, можна было б расказаць, якім смачным абедам і вячэраі накарміла нас у гэты дзень повар Таня Шаройка. Але для чаго? Я проста яшчэ раз узвёў затвор фотакамеры. І вось што з гэтага атрымалася.

**На здымках:** уздоўж па галоўнай вуліцы Старых Шаўроў;

нам песня будаваць дапамагае. Дапамагае яна і калгаснікам. Выступае атрадная агітбрыгада;

сёння — дзень ударнай працы;

повар Таня Шаройка.

Фотарэпартаж **В. Жука.**






# КАЛІ ЎСЁ ЎСПОМНІЦЬ...

**Вера Прокашава — сакратар камсамольскай арганізацыі механіка-матэматычнага факультэта БДУ імя У. І. Леніна. Але сёння мы прадстаўляем яе як ветэрана СБА, прайшоўшага шлях ад байца да камандзіра зацыянальнага штаба самага вялікага ў Беларусі выязнога зводнага атрада імя В. Харужай (Малдаўская ССР). Вера Пракашава расказвае...**

...Мне ўспамінаецца верасень 1963 года. У інтэрнаце — хваляванне. Ноччу прыязджаюць студэнты-цаліннікі. Мы, першакурснікі, задоўга да прыбыцця эшалона прыйшлі на вакзал глядзець, як на перон будзе выходзіць «асобы народ». Але з вагонаў выскоквалі самыя звычайныя юнакі і дзяўчаты. Тут жа, на мітынгу на Прывакзальнай плошчы, мы далі клятву быць вернымі справе першых будатрадаўцаў. Лета 1964 года студэнцтва БДУ сустракала заявамі: «Прашу залічыць мяне ў любы студэнцкі будаўнічы атрад. Жадаю быць там, дзе мая праца патрэбна людзям. Будаўнічых спецыяльнасцей не маю, буду рабіць усё...»

І выраслі будынкі, гаспадарчыя пабудовы, пракладваліся дарогі і масты ў Беларусі, Казахстане, Комі АССР, Дагестане і ГДР.

Добра помніць тыя гады Георгій Якаўлевіч Рылюк, тады — сакратар камітэта камсамола БДУ. Помніць конкурс у СБА сярод дзяўчат — 70 чалавек на месца. Былі і слёзы, і запэўніванні: калі не возьмеце ў атрад, паеду «зайцам».

Залічваліся лепшыя з лепшых, кожная кандыдатура абмяркоўвалася на камсамольскім сходзе курса, групы. Першыя атрады — іскра, і з яе трэба было распаліць касцёр будатрадаўскага руху. Прадстаяла барацьба з тымі, хто не верыў у сур'ёзнасць і важнасць пачатай справы. Кожным крокам трэба было даказваць, што студэнцтва сур'ёзна падыходзіць да выканання ўзятых абавязацельстваў, плануе работу не на тыдзень і не на месяц, а на многія гады. У песнях аб будатрадах часта гучыць слова «рамантыка». Нельга думаць, што ў атрадах лёгка. Там цяжка, так цяжка, часам мільгае думка: хутчэй бы ўсё гэта скончылася... Але ў атрадах дужэюць рукі, загартоўваюцца сэрцы, прыходзіць мужанне.

...Год 1967-ы — год пяцідзесяцігоддзя Вялікага Кастрычніка. Студэнты рэспублікі сталі на ўдарную вахту ў гонар юбілею. Жаданне адно: будаваць на «добра» і «выдатна». Ва Уральскай вобласці, куды мы прыехалі,— засуха, на тэрыторыі саўгаса «Долинский» перасохлі нават калодзежы. Але студэнты працавалі па-баявому. Рукамі байцоў СБА «Бярозка» БДУ пабудаваны тры чатырохкватэрныя дамы. У саўгасе «Любищенский» паявілася новая вуліца — Беларуская.

Многія студэнты вядуць лік часу па працоўных семестрах. Кожнае новае лета расшырае гарызонты. У мінулым годзе на будаўнічых аб'ектах п. Стражавога далёкай Томскай вобласці ішла вялікая работа па выкананню прынятых абавязацельстваў, разгарнулася барацьба за культуру працоўнага месца.

Гэтым летам мы працавалі на ўборцы ураджаю ў Малдавіі. Беларускі зводны атрад імя В. Харужай вёў барацьбу за якасць работы. Якасць на уборачнай — гэта дадатковыя тоны памідораў, персікаў, яблыкаў. Цёплае сонца Малдавіі падарыла моцную дружбу

## ВЕТЕР В ЛИЦО

Последний, прощальный
гудок
Пронесся над городом
ранью:
До встречи — родительский
дом!
Любимые — до свиданья!
Уйти со спецрейсами
вдаль,
Уйти, и не ради награды,
Уйти, чтобы помнить
всегда,
Рабочие будни отрядов.
Ну что ж мне?
Не брошусь им вслед —
Мне строить другие
объекты...
Пусть каждый оставит свой
след,
И будет натруженным
лето.
Зеленые куртки бойцов
Волнуют, как взгляды
любимых,
Как ветер, который в лицо,
Как поезд, промчавшийся
мимо...

Л. КОЛБАСКО



**Вось яны, студэнты, байцы пяцігодкі, людзі справы, майстры высокага класа — будатрадаўцы. Лепшыя фарбы верасня — ім, самыя цёплыя промні восеньскага сонца — ім, ласкавасць добрых слоў — таксама ім. Найлепшае спалучэнне, якое толькі змог захаваць фотааб'ектыў,— працавітыя, умелыя рукі і адкрытыя твары, шчырыя ўсмешкі.**

Фота **А. Басава** і **А. Лабады.**

# ЛІТАРАТУРНАЯ СТАРОНКА

## ЛЕГЕНДА БЯЗДОННАГА ВОЗЕРА

Вечарэе. Бледна-ружовая пазалота лажыцца на ціхую роўнядзь возера. Яна адбіваецца ад крыштальнай паверхні і пяшчотна, як каханая, абвівае прыбярэжныя дрэвы. Яны, усе ў ружовым, стаяць, як вартавыя памяці аб даўно мінуўшым, але незабываемым.

Ляжыць пасярэдзіне леса, з усіх бакоў акружанае хвоямі і елкамі, возера. Празрыстая цішыня стаіць вакол яго, абвалаквае і гіне дзесьці ў глыбіні, якой няма канца. Яно так і называецца — Бяздоннае. Прыгажосць возера прывабліве ў гэтыя месцы ўсё больш і больш турыстаў. Па вечарах ля кастра не змаўкаюць жарты і смех.

Потым раптам усе адразу змаўкаюць і слухаюць крыштальны звон вады, доўга любуюцца казачным стварэннем прыроды.

Паэзія напаўняе сэрца кожнага, ёй трэба вырвацца, ёй патрэбен прастор, і тут нехта ўсхваляваным голасам прамовіў: «Гэтае возера такое ж журботнае і цудоўнае, як і яго легенда».

І пачынае ціха, быццам баючыся разбудзіць заснуўшае ўжо возера:

«Жыў калісьці ў гэтых месцах бедны юнак, які пакахаў дачку багацея. Дзяўчына, прыгажосць якой асляпляла, як сонца, і зацямняла розум, як густая ноч, таксама пакахала яго. Але бацькі дзяўчыны не захацелі аддаць сваю адзіную дачку за чалавека, скарбам якога былі толькі прыгажосць і сумленнасць.

Доўга думаў юнак над тым, як дабіцца прыхільнасці бацькоў дзяўчыны, пакуль сэрца не падказала яму.

У тую пару ў лесе была дарога, па якой часта ездзілі купцы з атрыманымі ад продажу тавараў грашыма. І вось юнак вырашыў забіць купца і забраць яго скарб... Каханне штурхае на злачынства гэтак жа, як і на гераічныя ўчынкі.

Збудаваў юнак на гэтыя грошы ў лесе незвычайнай прыгажосці замак, абдарыў бацькоў нявесты дарагімі падарункамі, і вырашыў ён абвянчацца са сваёю каханаю ў гэтым замку.

Перад алтаром дзяўчына сказала:

— Калі ты сумленны чалавек, калі ніколі нікога не забіў і не абрабаваў — будзем мы з табою жыць, не ведаючы смутку і гора. Але калі ты вінаваты перада мною—нам суджана будзе загінуць.

Юнак, перапоўнены шчасцем, толькі пацалаваў руку нявесты, і іх абвянчалі.

Калі ксёндз, што іх вянчаў, прыйшоў у памяшканне для начлега, яго акружылі густою павуцінаю словы: «Уцякай адсюль, уцякай адсюль...».

Не прымушаючы сябе доўга ўгаворваць, ксёндз паехаў дадому. Па дарозе той жа голас таямніча прашаптаў яму: «Ты забыў на стале малітвеннік». Павярнуў ксёндз каня назад і паехаў да замка. Прыехаў, а замка ўжо няма, на яго ж месцы — возера, па якому плыве малітвеннік — адзіная не заплямленая крывёю рэч у гэтым замку. Схапіў ксёндз малітвеннік і—прэч адгэтуль. А возера аказалася бяздонным. Як чалавек забірае з сабою ў магілу тайну, так і гэтае возера пажадала захаваць ад людзей прычыну гібелі кахання, дзеля якога некалі пайшлі на злачынства».

Усе замоўклі, слухаючы легенду Бяздоннага возера. Ужо ноч накрыла чорнай хусткай лес і возера. І толькі залатым шлячком па ёй блішчыць, пераліваецца святло Месяца.

**А. ПЕРХАРОВІЧ,**
**студэнтка III курса вячэрняга аддзялення факультэта журналістыкі.**

НАВЕЛА

В. ЗАДАЛЯ.

## ДЗЕДАВА ПТУШКА

Кукавала зязюля.

Стары ляснік дзед Мікалай зірнуў на гадзіннік, што вісеў на сцяне пакоя, сказаў:

— Пара. Пакуль дойдзеш да шашы, якраз аўтобус падаспее.

Мы крочым па ледзь прыкметнай сцяжынцы, пратаптанай сярод векавых дрэў. Маўчым. За тыя дні, якія я гасцяваў у дзеда, перагаварылі аб усім. Цяпер кожны думае сваё. Я прыслухоўваюся да далёкага кукавання, пытаюся:

— А што, зязюля ўсё тая?

— Ага, яна самая, — пацвярджае дзед.— Птушка не паставіла апошнюю кропку ў лічэнні маіх дзён. Чуеш, лічыць... Вось так і жывём.

Зязюля пасялілася каля леснічоўкі даўно. Паводле расказа старога, ён знайшоў яе ў лесе акрываўленай, ледзь жывой. Птушка, відаць, пабыла ў лапах драпежніка, але нейкім цудам выратавалася. Дзед Мікалай прынёс яе дадому, вылечыў. Нібы ў падзяку за клопат, зязюля пасялілася непадалёку ад лесніковай хаты...

— Ну, будзем развітвацца, сынок, — гаворыць дзед.— Да шашы рукой падаць, не заблудзішся ў трох соснах. Калі што спатрэбіцца — пішы. Буду чакаць.

Ён знік сярод дрэў. Далей я крочыў адзін. Голас зязюлі то набліжаецца, то адступае ў глыбіню лесу. Вось яна закукавала зусім побач.

Раптам грымнуў стрэл. Сухі, здрадніцкі, нібы ў спіну. Птушка змоўкла. Стала ціха-ціха. Здавалася, нават дрэвы прыслухаліся. Я спыніўся. У сэрца закралася неразумелае прадчуванне.

Больш голасу зязюлі я не чуў. Ці стрэл быў трапны, ці птушка не пажадала лічыць гады невядомаму паляўнічаму.

...Ён быў не стары яшчэ чалавек. Відаць, з гарадскіх. Адной рукой прытрымліваў стрэльбу, другой трымаў каля сябе пусты рукзак.

Я прысеў побач, запытаў:

— Як паляванне?

— Ат! — скрывіўся, як ад зубнога болю, паляўнічы.— Бадзяўся, бадзяўся, нібыта той дурань, а толку,— ён патрос пустым рукзаком, — аніякага. Каб хоць вавёрку якую ці што...

Паляўнічы крыху памаўчаў, потым дадаў:

— Сёння ўпершыню выбраўся на паляванне. Не пашанцавала. Але нічога. Для першага разу хопіць і гэтай птушачкі. Будзе чым кату паласавацца.

Маё сэрца на імгненне спынілася, зрабілася горача. Зязюля! Дзедава зязюля! Дык вось хто абарваў тваё кукаванне!

— Чаго вы так глядзіце? Я ж па закону...

— Не, не па закону... Няма такога закона, каб зязюль страляць... Ты можа камусьці жыццё абарваў, у чалавека страляў...

— Я вас не разумею. Чаго вам трэба? Каму я жыццё абарваў? Што за вар'яцтва вы гаворыце? Вы што, з глузду з'ехалі?

Вадзіцель, які слухаў нашу размову, спыніў аўтобус.

— Вылазь! — загадаў ён паляўнічаму.— Вылазь, пакуль дабром прашу...

— Якое вы маеце права! — заверашчаў той.— Я плаціў за праезд! Я буду скардзіцца!..

Аўтобус крануўся. Але нечакана стаў. Вадзіцель кінуў пад ногі паляўнічаму пяцьдзесят капеек.

— Ёсць жа такія! — усхвалявана прамовіў шафёр.

...Праз тыдзень я зноў крочыў па ледзь прыкметнай сцяжынцы. Упершыню дзед Мікалай не праводзіў мяне. Некалькі дзён назад я атрымаў страшную вестку: ляснік памёр.

Раптам я ўскінуў галаву. Мне здалося, што дзесьці каля апусцелай леснічоўкі падала голас зязюля. Сэрца ўстрапянулася. Я прыслухоўваўся з паўгадзіны. Цішыня. Нікога. Нават лес не гамоніць.

Маўчала зязюля.



**Пяршыць у горле холад ранні,**
**І цэдзіць медзь прамень скупы...**
**Клін жураво́ў рабіну раніў...**
**Начлег скубе цяпло з капы...**
**Спадае летняе пахмелле,**
**Развага ясніць мар ваду,**
**І галава цвяроза меле**
**Зярняты выспеўшых задум.**
**Ты не лічы, што перажыта,**
**Што спалена ў крыві рабін:**
**Прыходзіць час, каб сеяць жыта.**
**Прыходзіць час рабіць, рабіць...**

**А. КАМАРОЎСКІ.**

Фота **М. ХАМЦА.**



## ПІСЬМО МАЦІ

Я часта бачу іх у сне. Амаль нават адчуваю пяшчотны дотык крыху загрубелых ад працы, не па-жаночы моцных тваіх далоней. Яны цёплыя-цёплыя. Нават тады цёплыя, калі ты ў халоднай, толькі што з калодзежа вадзе палошчаш бялізну, развешваеш яе на тоненькай вяровачцы.

І вось ты ўжо ўваходзіш у гарача напалены пакой. Мы, маленькія, бяжым насустрач і сваімі ручкамі грэем твае пачырванеўшыя, але чамусьці гарачыя рукі. Ты, усміхаючыся, глядзіш на нас зверху. Мы таксама глядзім і здзіўляемся: якая ты у нас добрая і прыгожая!

А ты сапраўды такая. Самы маленькі з нас, з чорнымі вялікімі вочкамі, вельмі падобны на цябе. Магчыма, у дзяцінстве ты таксама была такой. А яно было нялёгкім, тваё дзяцінства. Мы часта просім расказаць аб тым, як даводзілася хавацца ў лесе ад салдат у чужой форме, як потым вучылася ты ў маленькай школе. Мы ўслухоўваліся ў твой голас, моцна прыціскаючыся да цябе, паўтаралі за табою радкі купалаўскага «Хлопчыка і лётчыка», прасілі прачытаць яшчэ аб коціку, які ўкалоў лапкі аб калючы клубочак-вожык, расказаць ужо вывучаную напамяць казку. Мы засыналі пад твой роўны голас, адчуваючы твае рукі, калі ты пераносіла нас у ложак.

Раніцою гэтыя ж рукі ласкава ўкрывалі коўдрай, закрывалі акно занавескай, каб яркія праменні не перашкаджалі салодкаму сну.

Мы радаваліся, калі ўсе ўтраіх ішлі ў школу, калі прыносілі добрыя адзнакі.

А цяпер мы ўжо не школьнікі. Праводзячы ў дарогу, ты толькі просіш: «Беражыце сябе. І пішыце. Хоць некалькі радкоў...». Непрыкметна выціраючы вочы, доўга глядзіш услед аўтобусу. І зноў чакаеш, калі мы ўсе збяромся ў доме, калі зноў пачуюцца бесклапотныя галасы, пальецца песня. Бо ты любіш слухаць і падпяваць нам. Твой прыгожы моцны голас не выдзяляецца сярод нашых, а зліваецца з імі.

Я памятаю, мама, твае песні, якія ты спявала, нахіліўшыся над шыццём, хоць той час аддзяляе доўгая чарада дзён, месяцаў, год.

Мы выраслі. У вёсцы гавораць: «Ты, Марыя, з дочкамі ўсё роўна як з сёстрамі». Ты глядзіш на нас, крыху здзіўляешся і ўспамінаеш сябе такой жа маладой.

Мы выраслі, мама. Ты пастарэла, вакол вачэй паявіліся тоненькія павуцінкі зморшчынак. А нядаўна ў тваіх чорных валасах я ўбачыла некалькі серабрыстых нітачак. Ты заўважыла мой позірк і неяк вінавата ўсміхнулася.

Не трэба, мама, саромецца сівізны! Яна не старыць цябе. Яна толькі сведчыць аб тых бяссонных начах, якія ты правяла над намі, раптам захварэўшымі.

У народзе кажуць: «Маленькія дзеці—малыя клопаты, вялікія дзеці—вялікія клопаты». Ты старалася адвесці нашы дзіцячыя нягоды, падзяліць іх з намі. Цяпер мы таксама нясём табе ўсе свае клопаты, дзелімся дзявочымі тайнамі. І ты нас разумееш, падказваеш, даеш парады.

Як часта не хапае побач цябе, твайго падбадзёрваючага слова! Але ў думках мы звяртаемся да цябе. Бо ты вучыла нас толькі добраму.

Атрымліваючы дробна спісаныя лісткі са школьнага сшытка, здаецца, адчуваеш дотык тваіх гарачых рук.

Ты з намі, а гэта значыцца — з намі ўвесь свет, уся блакітная планета, на якой жывуць такія ж, як і ты, жанчыны, якія носяць ганаровае званне — маці!

**М. БУРЭНКА,**
студэнтка.

В. а. рэдактара
В. А. ВОЛЬСКІ.

«Белорусский университет» — орган парткома, ректората, месткома, комитета комсомола и профкома Белорусского ордена Трудового Красного Знамени государственного университета им. В. И. Ленина. На белорусском языке.

Газета выходзіць па чацвяргах. Тыраж 2.000 экз.
Аб'ём — 1,5 друк. ар. АТ 01403. Заказ № 1277.

Наш адрас: Мінск, Універсітэцкі гарадок, геаграфічны корпус, п. 14. Тэлефон 22-07-19. Ордэна Працоўнага Чырвонага Сцяга друкарня выдавецтва ЦК КП Беларусі.